Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט זיך!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

16-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

НЯДЗЕЛЯ
4 СЬНЕЖНЯ 1932 г.
№ 267 (3636)

ТЭЛЕФОНЫ:
Адказн. рэдактара 7-09
Адказн. сакратара 4-78
Сэкстароў . . . 6-15
Пачная рэдакцыя 12-65 (два званкі)
Выдавецтва . . 2-44

УМОВЫ ПОДПІСКІ:
1 месяц . . . 1 руб.
3 „ . . . 3 „
6 „ . . . 6 „
Падпіска прымаецца выключна на пошце лістаносцамі.
Рукапісы не зьвяртаюцца.

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.

КОШТ АБ'ЯВЫ
1 радок нонпарэлі 1 ру

КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ
1 дакумэнту аб згубе 2 руб.

Татарскай АССР і Маскоўскай вобласьці дазволены бесьперашкодны продаж хлеба

Пастановай СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 3-га сьнежня калгаснікам і працоўным аднаасобнікам Татарскай АССР і Маскоўскай вобласьці дазволены бесьперашкодны продаж свайго хлеба у сувязі з датэрміновым выкананьнем гадавога пляну хлебазагатовак (ТАСС)

Аб разьмеркаваньні даходаў у колгасах за 1932 год

Пастанова ЦК КП(б)Б

ЦК адзначае буйныя посьпехі, якія дасягнуты калгасамі БССР у 1932 г. Гэта вызначаецца ў тым, што пасеўная плошча калгасаў павялічылася да 60,6 проц. Калгасы поўнасьцю выканалі плян веснавой сяўбы і лепш, чым у мінулым годзе правялі ўборку ўраджаю, скараціўшы тэрміны ўборкі па асноўных культурах на 15 дзён у параўнаньні з мінулым годам. Усё гэта значна падвысіла даходнасьць калгасьнікаў супроць мінулага году.

Дасягнутыя посьпехі ў арганізацыі на-гаспадарчым умацаваньні калгасаў ёсьць вынік бальшавіцкай барацьбы за ажыцьцяўленьне пастаноў ЦК Усе КП(б) аб арганізацыі сталых вытворчых брыгад у калгасах, будаўніцтва новых МТС, укараненьня зьдзельшчыны, барацьбы з дробна-буржуазнай ураўнілаўкай, абязьлічкай,—рэзультат барацьбы за ажыцьцяўленьне лініі партыі ў галіне калгаснага будаўніцтва.

Адзначаючы станоўчыя вынікі, якія адыграла папярэдняя выдача грашовых натуральных авансаў у сэнсе ўздыму прадукцыйнасьці працы ў калгасах і павышэньні зацікаўленасьці кожнага калгасьніка ў выніках калектыўнай працы—ЦК адначасова адзначае адсутнасьць дастатковай увагі з боку большасьці раённых і вязавых партыйных, савецкіх і зямельна-калгасных арганізацый, а таксама МТС да пытаньняў разьмеркаваньня даходаў у калгасах за 1932 год. Яшчэ не ўстаноўлена поўнасьцю папярэдняе складаньне плянаў разьмеркаваньня даходаў, дасканалы ўлік працы, выяўленьне працы лепшых брыгад і брыгадзіраў, вывучэньне становішча кожнага калгасу, зьнішчэньне ўраўнілаўкі, мэханічнага падыходу да кіраўніцтва калгасамі і г. д.. Гэтым самым партарганізацыі ня ўлічваюць урокаў мінулага году: памылак і скажэньняў лініі партыі, дапушчаных пры разьмеркаваньні даходаў, што мела ў адмоўным сэнсе адбітак па радзе месц і раёнаў на арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў і ў прыватнасьці зьявілася аднэй з прычын выхадаў з калгасаў у веснавую пасеўную кампанію і ў час уборачнай.

ЦК надае выключна важнае гаспадарчае і палітычнае значэньне разьмеркаваньню даходаў у калгасах за 1932 год, што непасрэдна зьвязана з далейшым арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньнем калгасаў, умацаваньнем ролі брыгадзіра і брыгады як асноўнага зьвяна калгаснай вытворчасьці, сваячасовым выкананьнем цэнтралізаванага пляну загатовак, разгортваньнем калгаснага гандлю і павышэньнем ураджайнасьці.

ЦК КП(б)Б ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. У тых калгасах, якія поўнасьцю выканалі ўстаноўленыя для іх пляны дзяржаўных загатовак і ссыпалі насенныя і фуражныя фонды, безадкладна прыступіць да разьмеркаваньня паміж калгасьнікамі ўсёй астатняй часткі належачых им грошай, харчовых і кармовых прадуктаў.

НКЗ і Калгасцэнтру БССР работу па складаньні плянаў канчатковага разьмеркаваньня даходаў у калгасах за 1932 г. разгарнуць так, каб скончыць разьмеркаваньне даходаў ва ўсіх калгасах да 15 студзеня 1933 г і зрабіць поўны разьлік і выдачу ўсіх належачых калгасьнікам даходаў па працаднёх не пазьней 1 лютага 1933 года.

Неабходна забясьпечыць правядзеньне ў жыцьцё ўказаньня ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб тым, што лёнаводчыя і канапляводныя калгасы пасьля выкананьня пляну збожжазагатовак, робяць разьмеркаваньне паміж калгасьнікамі 70-80 проц. ад агульнага фонду збожжа, належачага да разьмеркаваньня.

Астатнія 20-30 проц. фонду павінны быць разьмеркаваны паміж калгасьнікамі пасьля скончэньня масавай апрацоўкі лёну і канапель в улікам колькасьці працадзён, затрачаных кожным калгасьнікам на пасеў, уборку і апрацоўку гэтых культур.

Галоўнай і цэнтральнай задачай у рабоце калгасаў зьяўляецца барацьба за якасьць працы і таму ЦК прапануе забясьпечыць пры разьмеркаваньні ўраджаю і даходаў правядзеньне ў жыцьцё ўказаньняў ЦК і СНК аб павышэньні і зьніжэньні ацэнкі працадня або колькасьці працадзён для брыгад і брыгадзіраў у межах ад 10 да 20 проц. у залежнасьці ад якасьці работы.

2. ЦК асабліва падкрэсьлівае як бая вую задачу для ўсіх калгасаў сваячасовае выкананьне пляну загатовак і асабліва засыпку і стварэньне насенных і фуражных фондаў. У кожным калгасе пасьля выкананьня цэнтралізаванага пляну загатовак, не пазьней, як праз дэкаду павінны быць створаны насенныя фонды ў разьмеры, якія поўнасьцю забясьпечваюць насеньнем пасеўныя плошчы 1933 году.

Ускласьці непасрэдную адказнасьць за стварэньне і захаваньне насенных фондаў на старшынь калгасаў.

Даручыць РК КП(б)Б, РВК, РайККІ і зямельна-калгасным органам да моманту канчатковага разьмеркаваньня даходаў у кожным калгасе—праверыць правільнасьць складаньня пляну разьмеркаваньня даходаў і ў прыватнасьці дасканала праверыць ці прыцягнуты актыў, ударнікі і брыгадзіры да абгаварэньня пляну разьмеркаваньня даходаў, а таксама ці праведзена абгаварэньне пляну на агульных сходах калгасьніка. Забараніць, дзе гэтыя мерапрыемствы не праведзены, прыступаць да разьмеркаваньня даходаў, поўнасьцю выканаўшы дырэктывы ЦК аб прыцягненьні калгасьнікаў да абгаварэньня плянаў разьмеркаваньня даходаў.

3. Абавязаць райкомы, РВК і зямельна-калгасныя органы поўнасьцю ажыцьцявіць дырэктыву аб тым, каб «пры разьмеркаваньні фуражу ўлічваць наяўнасьць жывёлы у калгасьніках з тым, каб калгасьнікі не атрымоўвалі фуражу, альбо атрымоўвалі менш фуражу, узамен гэтага атрымоўвалі другі від натуральнай прадукцыі, не выходзячы аднак за межы ўстаноўленага ў даным калгасе разьмеру натуральных выдач на працадзень» (З пастановы ЦК УсеКП(б)).

4. Паставіць ў цэнтры ўвагі партыйных і зямельна-калгасных арганізацый барацьбу супроць разбазарваньня працадзён у калгасах. Абавязаць РК і зямельна-калгасныя органы дабіцца рашучага скарачэньня адміністрацыйна-кіруючых выдаткаў, скараціўшы іх да 1,5—2 проц.

Устанавіць такі парадак, што грамадзкія работы і гаспадарча-палітычныя кампаніі, як правіла, праводзіцца калгасьнікамі ў парадку грамадзкай нагрузкі, без налічэньня працадзён. Зьняць з аплаты за кошт колгасаў усіх асоб, ня маючых непасрэдных адносін да калгаснай вытворчасьці (сельскія выканаўцы, работнікі капэрацыі, члены с-саветаў, калі яны не працуюць на калгаснай вытворчасьці, акрамя настаўнікаў. Катэгарычна забараніць усім раённым і сельскім, партыйным, савецкім і калгасным арганізацыям утрыманьне за кошт калгасаў службовых асоб гэтых арганізацый, а таксама ўтрыманьне без аплаты калгасам розных упаўнаважаных і камандыраваных).

Пры разьмеркаваньні даходаў павінен быць строга праведзены такі парадак, пры якім адміністрацыйна-упраўленчы склад калгасаў незалежна ад колькасьці налічаных ім працадзён, не павінен атрымліваць вышэй тэй колькасьці натуральнай прадукцыі, якую атрымлівае ў сярэднім у даным калгасе калгасьнік сталай брыгады, добрасумленна выконваючы ў працягу году ўсе даручаныя яму работы.

Пры разьмеркаваньні даходаў неабходна з тымі гаспадаркамі, якія вышлі з калгасаў у час веснавой сяўбы, а таксама ў час уборкі,—разьлічвацца за фактычна выпрацаваную колькасьць працадзён.

5. ЦК КП(б)Б абавязвае за лік скарачэньня адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў, перагляду і скарачэньня ўсялякага роду фондаў, зьніжэньня кошту новага будаўніцтва, зьнішчэньня страт пры апрацоўцы ільну, поўнага пераворваньня бульбы і скарыстаньня ўсёй наяўнасьці свабоднай рабочай сілы на работах па вывазцы лесу, дарожным будаўніцтве і іншых работах, дабіцца таго, каб калгасьнік атрымаў ва ўсякім выпадку ня менш таго, што атрымана на рукі калгасьнікамі ў мінулым годзе, пры абавязковым, першачарговым і поўным выкананьні пляну дзяржаўных загатовак, ссыпкі насенных фондаў.

6. Адзначаючы вялікую ролю МТС, як арганізатараў і кіраўнікоў калгаснай вытворчасьці, ЦК абавязвае аддзяленьні Трактарацэнтру, асабліва дырэктароў і кіраўнікоў вытворчых вучасткаў МТС—наладзіць сталую дапамогу ў абслугоўваемых калгасах па разьмеркаваньні ўраджаю шляхам непасрэднага ўдзелу работнікаў МТС у разьмеркаваньні даходаў у кожным калгасе паасобку і на падставе правільнага разьмеркаваньня даходаў гэтага году дабіцца лепшай арганізацыі работы сталых вытворчых брыгад, укараненьня агратэхнікі і павышэньня ўраджайнасьці.

7. ЦК КП(б)Б лічыць работу па разьмеркаваньні даходаў у калгасах—асноўнай задачай партыйных арганізацый на бліжэйшыя два месяцы і прапануе РК КП(б)Б і вясковым ячэйкам забясьпечыць самае канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва кожным калгасам па ўсіх пытаньнях, зьвязаных з разьмеркаваньнем даходаў, прычым асаблівую ролю ў гэтай справе павінны адыграць ячэйкі і пасобныя камуністы калгасаў і МТС.

ЦК абавязвае РК КП(б)Б устанавіць такое кіраўніцтва справай разьмеркаваньня даходаў у калгасах, каб пры кожным выпадку зьніжэньня даходаў калгасу і калгасьніка ў параўнаньні з мінулым годам, быў камандыраваны адказны прадстаўнік РК КП(б)Б для высьвятленьня прычын і прыняцьця неабходных мер на месцы.

Абавязаць усе Райкомы і ячэйкі КП(б)Б абгаварыць зараз пытаньне аб разьмеркаваньні даходаў у калгасах і прыняць практычныя мерапрыемствы па правядзеньні гэтай важнейшай кампаніі.

У мэтах арганізацыі лепшага правядзеньня разьмеркаваньня даходаў і шырокай папулярызацыі дасягнутых посьпехаў в калгасным будаўніцтве, лічыць неабходным:

а) даручыць Культпропу ЦК разам з Калгасцэнтрам, Навукова-дасьледчым калгасным інстытутам, газэтамі—«Зьвязда» і «Савецкая Беларусь» укамплектаваць ня менш 3-х літаратурных брыгад. Паставіць задачай гэтых брыгад,—на працягу ўсяго пэрыяду разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю, не радзей аднаго разу ў пядзёнку, на вопыце канкрэтных калгасаў разгарнуць паказ на старонках газэт узораў правільнага разьмеркаваньня ўраджаю, а таксама дрэннай практыкі ў гэтай справе;

д) даручыць Дзяржвыдавецтву Беларусі тэрмінова выдаць масавым тыражом ня менш 2-3 папулярных брашур аб разьмеркаваньні ўраджаю і даходаў у калгасах за 1932 год.

в) Абавязаць Культпроп ЦК і Калгасцэнтр у дэкадны тэрмін падрыхтаваць і выдаць макет насыценнай газэты па выніках гаспадарчага году у калгасах, прадугледзіўшы ў макеце свабоднае месца для занясеньня прозьвішчаў калгасьнікаў—сапраўдных ударнікаў калгаснай вытворчасьці, а таксама лодыраў і прагульшчыкаў з вынікамі разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю.

г) Даручыць Агітмасаваму Аддзелу ЦК разам з Калгасцэнтрам укамплектаваць 2 моцныя брыгады і паслаць іх у два вясковых раёны з абавязацельствам арганізаваць там узорную работу па разьмеркаваньні даходаў і ўраджаю ў калгасах з тым, каб перадаць іх вопыт усім астатнім раёнам рэспублікі.

д) Вылучыць па адным працаўніку са складу раённага актыву на кожныя 5-7 калгасаў, абавязаўшы іх заставацца ў калгасах да поўнага скончэньня работ па разьмеркаваньні даходаў.

е) Забясьпечыць такі парадак кіраўніцтва разьмеркаваньнем даходаў, пры якім скарга калгасьніка на няправільна праведзены з ім разьлік была-б уважліва разгледжана на працягу ня больш 3-5 дзён і па ёй былі-б прыняты адпаведныя меры.

ж) У ходзе разьмеркаваньня даходаў лічыць неабходным аклікаць куставыя нарады сакратароў РК, кіраўнікоў Райза і дырэктароў МТС для абмену вопытам у справе арганізацыі разьмеркаваньня даходаў і прыняцьця раду мер для палепшаньня пастаноўкі гэтай справы.

з) У пэрыяд з 1-га сьнежня ўсім Райкомам і Райкалгассаюзам правесьці раённыя нарады жаночага актыву калгасаў з мэтай мабілізацыі жаночых мас для ўдзелу ў разьмеркаваньні даходаў у калгасах; правесьці таксама нарады ўсіх старшынь калгасаў, разам з рахункавымі працаўнікамі, па пытаньнях разьмеркаваньня даходаў у калгасах, на-ходу выпраўляючы недахопы, выкрытыя ў гэтай рабоце.

і) Даручыць ЦК ЛКСМБ распрацаваць па сваёй лініі рад канкрэтных мерапрыемстваў, зьвязаных з павышэньнем удзелу і ролі камсамольскіх ячэек у разьмеркаваньні даходаў.

9. Для канкрэтнай дапамогі калгасам у правядзеньні разьмеркаваньня даходаў даручыць Менскаму Гаркому КП(б)Б і Гарпрафсавету да 5 сьнежня гэтага году мабілізаваць у дапамогу калгасам блізкаляжачых раёнаў ня менш 150 рахункавых працаўнікоў, галоўным чынам за лік цэнтральных апаратаў, Гомельскаму ГК і Гарпрафсавету—ня менш 75, Віцебскаму ГК і Гарпрафсавету—ня менш 75, Магілёўскаму, Бабруйскаму і Аршанскаму РК і Райпрафсаветам—ня менш, чым па 30 рахункавых працаўнікоў. Даручыць РК адначасова мабілізаваць маючыйся ў раёнах рахункавы апарат для дапамогі калгасам.

Гэта мабілізацыя павінна быць праведзена за лік рахункавых працаўнікоў, ведаючых умовы калгаснай вытворчасьці і здольных аказаць сапраўдную дапамогу калгасам.

10. Абавязаць Агітмасавы Аддзел ЦК КП(б)Б к 1-XII—32 г. мабілізаваць 60 чал з ліку цэнтральнага актыву для пасылкі іх на месяц у дапамогу раёнам па правядзеньні работы па разьмеркаваньні даходаў і ўраджаю ў калгасах. Арганізаваць самае ўважлівае інструктаваньне гэтых работнікаў, абавязаўшы т.т. Гікало і Шаранговіча выступіць на інструкцыйнай нарадзе.

Лічыць неабходным прымацаваць да паасобных раёнаў на час работ па разьмеркаваньні ўраджаю і даходаў у калгасах членаў Бюро ЦК і кіруючых цэнтральных работнікаў, абавязаўшы іх пабываць за гэты час у 2-3 калгасах і прыняць непасрэдны ўдзел у рабоце па разьмеркаваньні даходаў.

11. ЦК КП(б)Б папярэджвае ўсе партыйныя, савецкія, зямельна-калгасныя арганізацыі і МТС, што разьмеркаваньне даходаў у калгасах будзе праходзіць ва ўмовах кулацкага супраціўленьня і імкненьня кулацтва правесьці разьмеркаваньне па-ядоцкаму, ураўнілаўскаму «прынцыпу». Задача партыйна-савецкіх арганізацый арганізаваць масы на рашучы ўдар па кулацкай дзейнасьці і разгарнуць вакол разьмеркаваньня даходаў шырокую масава-палітычную работу, з прыцягненьнем калгаснага актыву і мас калгасьнікаў.

Ва ўсёй масавай рабоце неабходна асоба падкрэсьліць задачы выкананьня калгасамі сваіх абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай (загатоўкі сельска-гаспадарчых прадуктаў), разгарнуць рашучую барацьбу з безгаспадарчасьцю, безадказнасьцю, расхлябанасьцю, абязьлічкай у рабоце калгасаў, з дробна-буржуазнымі і рваніцамі антыдзяржаўнымі тэндэнцыямі сярод пасобных груп адсталых калгасьнікаў. Выхаваньне ў калгасьніка пачуцьця гаспадара свайго калгасу, падвышэньне яго зацікаўленасьці ў калектыўнай працы, замацаваньне асноўнага зьвяна калгаснай вытворчасьці—брыгады, разгортваньне баявой падрыхтоўкі да вясны, барацьба са стратамі і за павышэньне ўраджайнасьці сацыялістычных палёў,—усё гэта павінна быць у цэнтры агітацыйна масавай работы па разьмеркаваньні даходаў і ўраджаю ў калгасах.

12. Пастанову апублікаваць у друку.

УСЕБЕЛАРУСКІ КОНКУРС

ДРУК У БАРАЦЬБЕ ЗА ФІНПЛЯН

АКТЫВІЗАВАЦЬ РАБОТУ КАМСОДАЎ

ДЛЯ ПОЎНАГА ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ ПА ДАБРААХВОТНЫХ ПЛАЦЯЖОХ

За перавыкананьне фінансавага пляну

Выкананьне фінансавага пляну мае выключнае значэньне ў справе пасьпяховага выкананьня прамфінплану. Тым больш, пачэсная задача кладзецца на наш завод, які з году ў год, з кварталу ў квартал пасьпяхова выконвае свой прамфінплян.

Між тым мы на фронце барацьбы за выкананьне фінпляну маем вялікі прарыў. За кастрычнік месяц мы павінны былі даць па ўкладах прыліку на суму 1.250 р., а далі адліку на суму 3.775 р.

З пытаньнем ахопу ўсіх рабочых калектыўным страхаваньнем таксама справа пастаўлена дрэнна. На сёньняшні дзень маем ахопленых 187 чалавек, не ахопленых калектыўным страхаваньнем 48 ч., па 2 хромавых цэху—32, па мэханічным—25, па жэлятынавым—23, па дапаможных рабочых—59.

50 чалавек уноў прыбыўшых рабочых на завод не ахоплены пазыкай.

Дрэнная работа камсоду прывяла да ганебнага прарыву. Замест 35.000 руб., якія мы павінны былі даць, мы далі ўсяго 15.829 р. Некаторыя камсоды цэхаў працуюць у асобе аднаго чалавека. Узяць, напрыклад, камсоды 1-га і 2-га хромавых цэхаў. Ня гледзячы на тое, што ў гэтых цэхах, шмат новых рабочых не ахоплена пазыкай, каля 00 чалавек сталых рабочых таксама не ахоплены калектыўным страхаваньнем, бо гэтыя камсоды працуюць у асобе аднаго чалавека.

Прафарганізацыі гэтых цэхаў зусім слаба дапамагаюць у рабоце камсодам. Мы маем такое зьявішча, што рад рабочых у час палучкі уносяць па 3—6 р. у апчадкасу але праз 7-8 дзён яны гэтыя грошы забіраюць на зад. Грамадзкія арганізацыі ніякай масава-растлумачальнай работы не праводзяць.

Такое становішча з выкананьнем фінпляну недапушчальна. Заводзкія арганізацыі павінны мабілізаваць усю грамадзкасьць завод выкананьня фінпляну. Разрыву паміж выкананьнем прамфінпляну і фінпляну не павінна быць. Зараз ў сувязі з абвешчаньнем газ. «Савецкая Беларусь» і іншых газэт усебеларускага конкурсу друку на выкананьне фінпляну IV кварталу, заводзкі друк павінен асабліва апэрацыйна працаваць. Кожная пяцідзёнка павінна быць сапраўдным бальшавіцкім арганізатарам мас у барацьбе за выкананьне фінпляну.

Заводзкія арганізацыі павінны ўзмацніць сваё кіраўніцтва і аказаць ўсямерную і штодзённую дапамогу ў працы камсодаў. Цэхавыя камсоды павінны быць укамплектаваны лепшымі ўдарнікамі цэхаў, якія-б на-бальшавіцку змагаліся за фінплян.

Брыгада: газ. «Сав. Беларусь»
МІНКІН,
ШАМЭС.

Недаацэньваюць конкурс

Чавусы. На 10 лістапада па Чавускім раёне квартальны плян выканаў усяго на 39,6 проц., касавае паступленьне па рэалізацыі пазыкі выканана толькі на 10,9 проц., прычым па гораде—22,1 проц., па вёсцы—6,6 проц., а па ўкладах ёсьць нават адліў. Такое ганебнае адставаньне раёну ў выкананьні фінпляну тлумачыцца тым, што няма апэрацыйнага кіраўніцтва з боку райфа і апчадкасы.

Ня гледзячы на неаднаразовыя папярэджаньні райфа і райапчадкасы аб уключэньні ва ўсебеларускі конкурс на лепшы камсод і лепшага грамадзкага інструктара, райфа і райапчадкаса нічога не зрабілі ў гэтым напрамку, нават не абгаварылі гэтае пытаньне на сходзе актыўла-фінансавага актыву.

«Загадчыкі нашых устаноў выехалі ў сельсаветы, а мы бяз іх ня можам уключыцца ў конкурс»,—так разважаюць супрацоўнікі райфа і райапчадкасы. Трэба рашуча ўдарыць па апартуністычнай недаацэнцы ўсебеларускага конкурсу на лепшы камсод і лепшага грамадзкага інструктара з боку фінансавых арганізацый Чавускага раёну.

Слова за раённай партыйнай арганізацыяй.

М. Аўхімаў

Мы бярэм на сябе канкрэтныя абавязацельствы

Жлобін. У сувязі з абвешчаным усебеларускім конкурсам на лепшы камсод і лепшага грамадзкага інструктара, Жлобінская раённая камісія садзейнасьці дзяржкрэдыту і апчадпораве, уключыўшыся ў конкурс, бярэ на сябе наступныя абавязацельствы:

датэрмінова выканаць квартальна-касавы плян па пазыцы да 15-XII гэтага году; выканаць квартальны плян калектыўнага страхаваньня, арганізаваць лепшае абслугоўваньне пазыкатрымальнікаў і ўкладчыкаў, арганізаваць масавую праверку выпрышаў па аблігацыях і на працягу дэкады арганізаваць на калгасным базары стол даведак і кіёск;

дабіцца стопроцантнай раздачы падпісчыкам аплочаных ранейшых пазык, правесьці канфэрэнцыю камсодаў і грамадзкіх інструктароў, фінактыву і ўкладчыкаў па пытаньні лепшага абслугоўваньня пазыкатрымальнікаў;

дабіцца арганізацыі праходзённых курсаў камсодаў і грамадзкіх інструктароў; стварыць неабходныя ўмовы для работы апчадкас, праверыць работу камсодаў, асабліва калгасных, і ажывіць іх дзейнасьць, узмацніўшы іх склад больш працаздольнымі працаўнікамі.

Арганізаваць тры выязныя пасяджаньні райкамсоду ў Пітэйчах, Мормале і Чырвоным Беразе з прыцягненьнем калгасаў і працоўных аднаасобнікаў для заслухоўваньня справаздач сельскіх і калгасных камсодаў.

да 1-га сьнежня скончыць замацаваньне аблігацый «IV-га заключнага».

Бяручы на сябе ўсе гэтыя абавязацельствы, на аснове сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, мы бязмоўна іх выканаем. Пры гэтым мы абавязуемся арганізаваць раённы конкурс з вязавых камсодаў для ажыцьленьня іх дзейнасьці з тым, каб выканаць і перавыканаць плян па добраахвотных працяжох IV кварталу.

П.

Датэрмінова выканалі фінплян IV кварталу

БЫХАЎ. (Па тэлеграфе).

Пашыранае пасяджаньне камсоду і райгазэты прыняла рашэньне ўключыцца ў конкурс на лепшы камсод і лепшага грамадзкага інструктара.

Райкамсод і газэта абавязаліся на аснове шырока-разгорнутага саопаборніцтва і ўжываньня сацыялістычных метадаў работы датэрмінова выканаць фінплян IV кварталу да 10 сьнежня.

Райкамсод Князев
Райгазэта Левін.

Лёнапрадукцыю—сацыялістычнай прамысловасьці

Ніводнага раёну, сельсавету, калгасу—

бяз удзелу ў правядзеньні усебеларускага конкурсу

4 сьнежня

Тэмпы лёназагатовак па БССР праходзяць яўна нездавальняюча. На 25 лістапада замест 70 проц. гадавога пляну ў сярэднім—плян загатовак выканан толькі на 19,7 проц., за пяцідзёнку з 20 па 25 лістапада прырост складае толькі 3,6 проц.

Асноўная прычына марудных тэмпаў загатовак, гэта ігнараваньне апрацоўкі тэхкультур якое мае месца ў радзе раёнаў.

Ня гледзячы на тое, што 80 проц. ураджаю лёну павінна быць перапрацавана ўручную, у радзе месц спадзяюцца, што ўся траста будзе перапрацавана на лёназаводах. На 25 лістапада засталося яшчэ неабмалочаным 3 проц. ураджаю, неразасланым—4,2 проц. не паднята са сьцелішча—13,6 проц. Гэта, па-першае пагражае тым, што вялікая колькасьць лёну можа застацца неапрацаванай, па другое — пералежваньне трасты на сьцелішчах дае вялікія страты, ператварае высокакаштоўную прадукцыю ў кудзелю.

Такое становішча ня можа быць цярпімым. РВК, райкалгассаюзы і МТС павінны стварыць рашучы пералом у справе апрацоўкі лёну і канапель. Задача саветаў — прасачыць за тым, каб арганізаваць падняцьцё трасты са сьцелішчаў, каб пад сьнегам не засталося ніводнага кліва лёну. Трэба праверыць гатоўнасьць сушыльна-мяльных пунктаў, арганізаваць правільную расстаноўку рабочай сілы па калгасах, шырока папулярызаваць ільготы, вызначаныя партыяй і ўрадам за сваячасовае выкананьне лёназагатовак.

Вялікім стымулам у паскарэньні апрацоўкі тэхкультур зьяўляецца абвешчаньне ўсебеларускага конкурсу на лепшае правядзеньне першапачатковай апрацоўкі і здачы таварнай прадукцыі. Раённыя арганізацыі і саветы абавязаны забясьпечыць 100 проц. удзел усіх гаспадарак у правядзеньні конкурсу.

Лёназагатоўкі зьяўляюцца адказнейшым вучасткам работы на вёсцы. Барацьба за лён павінна стаць штодзённай практычнай работай усіх партыйных, савецкіх і прафсыянальных арганізацый. Бальшавіцкім разгортваньнем работы, шырокім правядзеньнем масава-растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў аднаасобнікаў і рашучым націскам на кулака—забясьпечыць выкананьне пляну загатовак тэхкультур у вызначаныя партыяй і ўрадам тэрміны.

Ход першапачатковай апрацоўкі і загатоўкі лёну па БССР

(у процантах)

	На 25/XI		
	Газаслана	Паднята	Загат. лёнавалакна
	95,8	86,4	19,7
	Было на 20 XI		
	95,7	85,7	16,1

Па баявому змагаюцца за месца—у сьпіс гонару

Бешанковічы. Калгас імя СТАЛІНА (Аструскі сельсавет) па ўдарнаму праводзіць апрацоўку лёну. Па ініцыятыве старшыні калгасу тав. ХІТРАКОВА, брыгады па апрацоўцы лёну працуюць у тры зьмены.

Паміж пасобнымі брыгадамі і калгасьнікамі заключана сацыяборніцтва на хутчэйшае скончэньне апрацоўкі лёну і на выкананьне норм, выпрацоўкі. У выніку гэтага некаторыя калгасьнікі выпрацоўваюць норму на 125 проц.

Калгасьнікі калгасу імя СТАЛІНА абавязаліся ў бліжэйшыя дні скончыць апрацоўку і здачу (продаж) лёнапрадукцыі дзяржаве.

Дыбаль.

Смалявічы. (Наш кар.) Рад калгасаў раёну па-бальшавіцку змагаюцца за лён. Апрацоўка лёну была арганізавана сваячасова. Посьпех работ забясьпечыла сталая вытворчая калгасная брыгада. У выніку гэтага рад калгасаў цалкам скончылі апрацоўку лёну. Так, калгас «Чырвонаармеец» перапрацаваў 30 цнт. лёнавалакна, «Новыя Зуцяжкі»—10 цнт, імя КАЛІНІНА—50 цнт.,—Ленінец—3 цнт., «Добрабыт»—2 цнт. Цалкам скончыў апрацоўку лёну калгас «Калгасьнік Беларусі».

Райкалгассаюз і сельсаветы павінны арганізаваць неадкладную здачу лёнавалакна на прыёмныя пункты.

П. Кавалёў.

Вушачы. Калгас «Чырвоны Прымежнік» (Весьніцкі сельсавет) змагаецца за скончэньне апрацоўкі лёну ў вызначаны тэрмін. Лёнаапрацоўчыя брыгады расстаўлены правільна, падрыхтаваны сушыльна-мяльныя пункты, загатоўлены неабходны апал. Кожная брыгадзе вызначаны поўныя нормы выпрацоўкі.

На 20 лістапада калгас здаў (прадаў) дзяржаве першую партыю добраякаснага лёнавалакна (3 цнт.). Калгасьнікі абавязаліся скончыць апрацоўку і здачу лёнавалакна не пазьней 20 сьнежня.

Ярмош.

Крычаў. Перадавыя калгасы раёну паказваюць ударныя прыклады работы ў правядзеньні апрацоўкі тэхкультур.

Калгас «Панізоўка» на сёньняшні дзень скончыў першапачатковую апрацоўку лёнатрасты і зараз ідзе падрыхтоўка да апрацоўкі пянькі.

Набліжаецца да скончэньня апрацоўкі лёнатрасты калгас Дразды. Уся работа ў гэтым калгасе праходзіць пад лёзунгам—даць дзяржаве першага сорту лёнавалакна. Брыгады, занятыя па апрацоўцы лёну, паказваюць найлепшыя ўзоры работы. Брыгада Стручкова Рамана штодня пера апрацоўвае па 4 сушні лёнатрасты. Пасьля скончэньня работы брыгада падрыхтоўвае трасту для мяцьця на наступны дзень. Між брыгадамі разгорнута сацыяборніцтва і ўдарніцтва, каб скончыць апрацоўку трасты ў вызначаны тэрмін.

Вопыт перадавых калгасаў у барацьбе за лён трэба перанесьці ва ўсе калгасы раёну. (БЕЛТА).

Ніводнага кілёграма збожжа перакупшчыку і спэкулянту

ЗЛАМАЦЬ КУЛАЦКІ САБАТАЖ!

Выкрыць і пакараць спэкулянтаў збожжам

СТАРЫЯ ДАРОГІ. Раённы плян збожжазагатовак выкананы толькі на 84,3 проц. Наперадзе ідуць калгасы, якія ўжо набліжаюцца да завяршэньня збожжазагатовак (99,7 проц. пляну). Аднаасобны сэктар свой плян выканаў на 79 проц.

У авангардзе барацьбы за збожжа ідуць: Стара-Дароскі сельсавет, які выканаў плян на 98 проц., Пасецкі—91 проц., Горкаўскі—89 проц., Дараганаўскі—88,5 проц.

Ганебна адстае Кармазаўскі сельсавет, які плян збожжазагатовак выканаў толькі на 73 проц., Языньскі—73,5 проц.

Гэтыя сельсаветы і партячэйкі не мабілізавалі шырокіх мас працоўнага сялянства на барацьбу за збожжа, патураюць кулацка-заможным элемэнтам, якія не здаюць збожжа па цьвёрдых заданьнях. Ня гледзячы на тое, што ўсе тэрміны спагнаньня цьвёрдых заданьняў прайшлі, ніводная кулацка-заможная гаспадарка гэтых сельсаветаў яшчэ ня выканала сваіх цьвёрдых заданьняў. Кулак, агітуючы супроць здачы збожжа дзяржаве і ня выконваючы свайго цьвёрдага заданьня, спэкулюе збожжам, хавае яго па гумнах і г. д.

Па прымірэнчых адносінах да кулака, па спэкуляцыі збожжам, трэба нанесьці рашучы ўдар. Сельсаветы абавязаны неадкладна спагнаць цалкам цьвёрдыя заданьні з кулака, выкрыць усіх спэкулянтаў збожжам і прыцягнуць іх да суровай адказнасьці.

М. Шванкоў.

Кулаку не перашкаджаюць гандляваць

СЯННО. Стаўка раённых арганізацый, асобных сельсаветаў і партячэек на чарговасьць кампаніі прывяла да таго, што раён на 25 лістапада галавы плян збожжазагатовак выканаў толькі на 59,8 проц.

Асабліва бязьдзейнічаюць і зрываюць збожжазагатоўкі Беліцкі сельсавет (31,4 проц.), Машчанскі (47,7 проц.), Хадчанскі (48,3 проц.) і Расьнянскі (51 проц.). Аднаасобны сэктар гэтых сельсаветаў пляцецца ў хвасьце збожжазагатоўчай кампаніі.

Гадавое заданьне па цьвёрдых заданьнях выканана толькі на 40 проц. Гэтая лічба, кажа аб тым, што кулак працягвае сабатаваць загатоўкі, што кулацкаму сабатажу не супроцьпастаўлена арганізаванасьць калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў, што там не праводзяць масава-выхаваўчай работы, што з кулакамі працягваюць няньчыцца і не перашкаджаюць їм спэкуляваць збожжам. Асабліва гэта нагляднае ў Аляксіцкім сельсавеце, Беліцкім, Машчанскім, Лямойцецкім і Расьнянскім. Кулакі ў гэтых сельсаветах выканалі свае цьвёрдыя заданьні ад 18 да 30 проц., але ў той-жа час патаемна вывозяць збожжа на рынак і гандлююць їм.

Гэтага ні ў якім разе нельга дапусьціць. РК КП(б)Б і РВК павінны неадкладна нанесьці руйнуючы ўдар па кулацкім сабатажы і спэкуляцыі збожжам.

Б. Зяневіч.

930 цнт. звыш пляну

БАБРУЙСК. Казуліцкі сельсавет першым у раёне скончыў выкананьне пляну збожжазагатовак, даўшы звыш пляну 930 цнт. збожжа. Калгасы плян выканалі на 142,8 проц.

У ГОНАР ПЛЕНУМУ ЦК сельсавет абавязаўся скончыць лёназагатоўкі і ўзяў на буксір адстаючы Падрэчанскі сельсавет, накіраваўшы туды брыгаду.

У першую чаргу дзяржаве

ЧЭРВЕНЬ. Калгас «Чырвоны ўсход», Грабінецкага сельсавету, плян загатовак збожжа выканаў на 104 проц., бульбы—на 100 проц., мяса—на 114 проц., лёнасемя—на 100 проц.

Гэтых перамог калгас дабіўся таму, што калгасьнік

ЗА ГРАНІЦАЙ

Польшча

Польская вёска спыніла выплату падаткаў

ВАРШАВА. (ТАСС) У польскім друку ў апошні час зьявіліся артыкулы вядомых палітычных дзеячоў, якія яскравымі фарбамі малююць разбурэньне народнае гаспадаркі Польшчы.

Старшыня «Саюзу буйных прамысловцаў», так званага «Левіяфанту»—Вяржбіцкі піша: «І сельская гаспадарка, і прамысловасьць згінаюцца пад цяжарам крызісу. Мы мелі калісьці буйную тэкстыльную, будаўнічую і гарбарную прамысловасьць. Яна дасягла бліскучага разьвіцьця ў даваенны перыяд. Цяпер, аднак, амаль усе нашы старыя буйныя прадпрыемствы духнулі ды рассыпаліся на нашых вачох. У гарбарнай прамысловасьці пераважае жалкае саматужніцтва. У тэкстыльнай прамысловасьці панураецца саматужнае ткацтва».

Артыкул лідэра блёку мулацкіх партый Витаса пра становішча ў сельскай гаспадарцы ў некаторых газэтах мае загаловак: «Мёртва, як на могілках». «Шмат вёсак зусім перастаць плаціць падаткі ды ўсялякія подаці,—піша Витас,—насельніцтва вёсак харчуецца ўсё горш і горш. Соль бераглуць, як адзіную цяпер «прыправу». Ужываюць крамень на здабываньне агню, пераносяць жар ў гаршках з аднаго канца вёскі ў другі—усе гэтыя зьявы зрабіліся зусім зьвычайнымі. Страшэнна лютуюць сухоты, якія робяць жорсткія спустошэньні вёсак, асабліва сярод моладзі. Не гледзячы на марозы, насельніцтва ў многіх месцах ходзіць босым. Алошма дахаваны, што засталося ад мінулых гадоў, даношваюцца ды выходзяць з ужытку. Школы зусім спусьцелі. Людзі нават менш наведваюць кісьцёлы. Усё дрыжаць з жаху перад надыходам зімы. Няма мажлівасьці купіць апалу. Крадзеж зрабіўся штодзённай зьявай, адзіным сродкам для многіх падтрымаць сваё існаваньне. Напады, рабаўніцтвы растуць жахліва. Цяпер на сямлю не даходзіць адзіны чвэрць ранейшага ўраджаю. Вёска робіць уражаньне мёртвых могілак»

150 ахвяр пагрому ў Львове

ВАРШАВА. 3-XII. Антысэміцкія пагромныя выступленьні нацыянал-шавіністкай моладзі ў Польшчы працягваюцца.

У Львове лік ахвяр пагрому перавысіў 150 чалавек. Пагромшчыкамі спалены ўсе будынкі яўрэйскага спартыўнага стадыёну. У большасьці яўрэйскіх магазынаў выбіты шыбы. У Львоў сьцягнуты палицэйскія падкрапленьні з суседніх гарадоў.

Чорнасоценцамі выпушчана спэцыяльная адозва да палиціі, якая заклікае палицэйскіх салідарызавацца з антысэміцкімі выступленьнямі.

Напад на пошту

ВАРШАВА. 1-XII. Учора ў мястэчку Ягелёньскі Грудэн (поблізу гор Львову) зроблен узброены напад на мясцовае казначэйства і пошту. Двое нападаўшых былі забіты чыноўнікамі казначэйства. Пяць чыноўнікаў атрымалі сур'ёзныя параненьні. Удзельнікам нападу ўдалося ўзяць з касы ўсяго 4.000 злотых.

Палицэйскае паведамленьне ўскладае адказнасьць за напад на члена Украінскай Ваенная Арганізацыі.

Кітай і Японія

Руэгі абвясьцілі галадоўку

ШАНХАЙ. 2-XII. Камітэт па абароне Руэгаў паведамляе, што Руэгі абвясьцілі галадоўку, якая працягваецца ўжо сёмы дзень. Галадоўка пачата з прычыны адмаўленьня ўлады разглядзець паданую месяц назад заяву Руэгаў пра іх перавод у Сучжоў і задаволіць просьбу аб аблягчэньні наведваць турму іхняму сыну Руэгі паказваюць, што іх трымаюць у асобных камерах, пры чым пабачаньне да пушчаецца адзін раз на месяц. Руэгі ад моманту заключэньня ў турму хворыя і ня можа прыймаць ніякага харчу, як толькі гарбату з бісквітамі. Ад моманту арышту Руэгі праводзяць ужо шостую галадоўку.

Аб савецка-францускім пакце

ШАНХАЙ. 2-XII. Газэта «Дагунбао», каментуючы падпісаньне францка-савецкага пакту аб ненападзе зазначае, што заключэньне гэтага пакту зьяўляецца вялікай дыпляматычнай перамогай СССР. Дагавор—піша газэта,—зьнішчае нябясьпеку на заходніх границах СССР і павялічае напружанасьць становішча ў Эўропе.

Баі ў раёне Чжалантунь

ТОКІЁ. 2-XII. Паводле японскіх афіцыйных вестак японскае войска, зваяўшы станцыю Чжалантунь, рушылася на захад, накіроўваючыся да ўсходніх адрогаў Хінганскага храбта. У наступленьні ўдзельнічае некалькі сьсяч матарызаваных пяхоты з брыгад Храга і кавалерыйскай часьці. Паведамляюць, што першага чысла ў раёне Чжалантунь адбыліся вялікія баі. Тры часьці Су-Бін-Веня страцілі 200 чалавек забітымі. Пра японскія страты не паведамляецца.

Зрозных краін

Капіталы адплываюць з Фінляндыі

ГЕЛЬСІНГФОРС. 2-XII. Паводле сьцьвярджэньня лапуанскае (фашысцкае) газэты «Лакаўдэн-Сана», якая выдаецца ў Сэйнаках, лічыцца бязумоўным, што ўрад ужо на гэтым тыдні выйдзе ў адстаўку. Паводле слоў газэты, аграрыі, у сувязі з набліжэньнем новых выбараў у сойм, сьпяшаюцца пазбавіцца ад адказнасьці за ўрад. Кааліцыйная «Уусі Суомі» лічыць шкодлівую ўрадавую прапанову пра пониженую норму па крэдытах «з прычыны небясьпекі, што тым самым будзе ліквідаваны ўнутраны рынак крэдытуў», і зазначае, што ўрадавая прапанова зьяўляецца вынікам простага ультыматуму «кіраўніцтва аграрнай партыі не прадстаўніком у габінэце. У нязьўных абставінах характэрна паведамленьне «Суомэн-маа», што праз небясьпеку новай інфляцыі капіталы разнастайнымі шляхамі ўжо адплываюць з Фінляндыі за мяжу.

Канфэрэнцыя па ўстанаўленьні непасрэдных таварных зносін паміж краінамі

КАЎНАС (Коўна). 1-XII. Агенцтва «Эльта» паведамляе: «Сёньня адкрылася III канфэрэнцыя па ўстанаўленьні непасрэдных таварных зносін паміж Германіяй, Літвою, Латвіяй, Эстоніяй, СССР, Кітаем і Японіяй. Канфэрэнцыя адкрывася прамовай міністра шляхоў зносін. Канфэрэнцыя працягнецца каля 15 дзён.

„СССР стварыў новую Амэрыку"

ПРАГА. 3.XII. У Празе, на адкрыцьці выстаўкі савецкай архітэктуры, з вялікай прамовай выступіў паўнамоцны прадстаўнік СССР у Чэха-Славаччыне т. Аросеў. Выстаўка карыстаецца вялікім посьпехам, асабліваю ўвагу наведвальнікаў выклікае аддзел СССР. Вечарамі выстаўку наведваюць экскурсіі рабочых фабрык і заводаў Прагі. Левыя архітэктары наладзілі абслугоўваньне наведвальнікаў.

Паводле слоў буржуазнага друку, выстаўленыя здымкі—фото і маделі робяць уражаньне, што СССР стварыў «новую Амэрыку»

Забарона рэвалюцыйных газэт у Гішпаніі адменена

ПАРЫЖ. 3-XII. Паводле паведамленьне агенцтва ГАВАС, гішпанскі ўрад адмяніў забарону раду рэвалюцыйных газэт, у тым ліку і забарону камуністычнай газэты «Мундо Обрэро».

Лукнер.

УТЫЛЬЦЭХАМ, ПРАМАРЦЕЛЯМ—

максымум увагі саветаў дэпутатаў і сэкцыянэраў

Талачын выклікае Крулкі

Талачынскі РВК узяў на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў па пасьпяховым праведзеньні усебеларускага паходу саветаў за шырспажыву.

Намечаны наступныя мерапрыемствы: склікаць нараду савецкага актыву сумесна з гаспадарнікамі і старшынямі сампрамарцеляў, правесьці нараду рэйд па прадпрыемствах і сампрамарцелях па выяўленьні ўнутраных рэсурсаў. Арганізаваць новыя кравецкія і шавецкія арцелі.

11 сьнежня арганізаваць вывад сельска - гаспадарчых прадуктаў на рынак.

Прэзыдыум РВК вызначыў 30 чалавек савецкага актыву, якія прымацаваны да паасобных прадпрыемстваў і сампрамарцеляў для аказаньня практычнай дапамогі дэпутацкім групам у правядзеньні двухмесячніку, для заключэньня дагавораў па шэфстве дэпутацкіх груп над сампрамарцелямі і г. д.

Плянам намечана правесьці зьлёт дэпутацкіх груп і сэкцый.

РВК абвешчаны конкурс на лепшае правядзеньне двухмесячніку. Створан фонд у суме 1000 руб. для прэм'яваньня лепшых дэпутацкіх груп, сэкцый і паасобных дэпутатаў за лепшае правядзеньне двухмесячніку.

Талачынскі РВК выклікае на сацспаборніцтва Крулскі РВК. Арбітрам абрана газэта «Савецкая Беларусь».

Аўсеен.

Паход распачаты

ВОРША. 28 лістапада пры гарсавеце адбылася пашыраная нарада савецкага актыву, сумесна з дырэктарамі прадпрыемстваў і прадстаўнікамі прамарцеляй гораду па пытаньні рэалізацыі пастановы прэзыдыуму ЦВК аб двухмесячніку паходу за шырспажыву.

Прэзыдыум гарсавету ўключыўся ў абвешчаны паход, мабілізаваўшы ўвагу ўсіх дэпутацкіх груп і сэкцый на разгортваньне работы па шырспажыве.

Распрацаваны плян работы, у якім прадугледжана штодзённае апэрацыйнае кіраўніцтва двухмесячнікам па сэкцыях і прамарцелях.

На пашыранай нарадзе пры ўдзеле дырэктароў прадпрыемстваў і прадстаўнікоў прамарцеляй вынесена пастанова аб распрацоўцы на рабочых сходах пытаньня правядзеньня паходу, мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, пераапрацоўкі адыходаў і ўтыль сыравіны, прыцягненьня да актыўнага ўдзелу грамадзкасьці.

Намечана ў пачатку студзеня месяца правесьці калгасныя базары, з удзелам прадпрыемстваў і прамарцеляй, якія выробляюць тавары шырспажыву.

Са зробленых інфармацый з месцаў прадстаўнікоў прамарцеляй можна бачыць, што ня ўсе прадпрыемствы г. Воршы выконваюць пастановы ўраду аб перадачы сваіх утыльадыходаў для пераапрацоўкі прамарцелям Дырэкцыя мясакамбінату не прадстаўляе да гэтага часу адыходы (кішэчныя банкі) на пераапрацоўку таварам шырспажыву прамарцелі.

Нарада зьвярнула ўвагу прэзыдыума гарсавету на прыцягненьне да адказнасьці дырэкцыі за ігнараваньне пастановы ўраду па гэтым пытаньні.

Вынесена пастанова аб арганізацыі конкурсу на лепшае прадпрыемства і прамарцель, на лепшую дэпутацкую групу па ўдзеле ў паходзе.

Гарсаветам выдзелены фонд для прэм'яваньня лепшых дэпутацкіх груп, сэкцый і паасобных дэпутатаў.

На працягу двухмесячніку намечана адкрыць у горадзе пашывачную і пачыначную майстэрні

Адначасова на нарадзе вынялена, што ня ўсе дэпутацкія групы гораду ўключыліся ў паход.

Задача прэзыдыуму гарсавету — безадкладна разгарнуць масавую работу на прадпрыемствах, у сельсаветах, забясьпечыўшы апэрацыйнае, штодзённае кіраўніцтва двухмесячнікам.

Гурэвіч.

Дэпутацкая група на заводзе імя Варашылава бязьдзейнічае

На заводзе імя *Варашылава*, дэпутацкая група складаецца з старых рабочых-ударнікаў. На чале яе грамадзкасьцю вылучаны член гарсавету ударнік тав. *Андронаў*.

Здаецца, што гэта дэпутацкая група павінна была-б удзельнічаць ва ўсіх мерапрыемствах, якія праводзяцца партыяй і ўрадам, ва ўсім жыцьці заводу. Але-ж мы маем зусім адваротнае становішча.

Дэпутацкая група заводу імя *Варашылава* бязьдзейнічае. За мест таго каб склікаць савецкі актыў, на якім абгаварыць пастанову прэзыдыуму ЦВК аб двухмесячніку паходу, старшыня гэтай групы тав. *Андронаў* абмяжоўваецца такімі разважаньнямі: «Так, патрэбна было-б у бліжэйшы час што небудзь зрабіць, каб лепш паставіць работу дэпутацкай групы, але няма на гэта часу»

Член дэпутацкай групы тав. *Візгардзіцкі* расказвае: «Некалькі разоў мы гаварылі старшыні, што нам трэба сабрацца і пагаварыць аб нашай рабоце, што трэба нам уключыцца ў двухмесячнік паходу, а ў тав. Андронава адзін адказ «Пачакай, сабяромся, бачыш—усё часу няма»

Можа і праўда, што ў тав. *Андронава* часу няма і таму няма ніякай работы

Менгарсавету трэба неадкладна практычна дапамагчы дэпутацкім групам у правядзеньні двух месячніку.

П.

Уключыліся ў паход

Дэпутацкая група заводу «Чырвоны мэталіст» узяла шэфства над сампрамарцелью «Мэталіст» для аказаньня ёй практычнай дапамогі ў выкананьні пляну, наладжваньня масавай ўтылысырэчы ад заводу і г. д. ня ўтылысырэвіны ад заводу і г. д.

Вылучана брыгада ў падшэфны сельсавет для наладжваньня сувязі з дэпутацкай групай заводу, якой даручана заключыць сацумову з падшэфным сельсаветам на выкананьне ўсіх мерапрыемстваў, намечаных паходам.

Дэпутацкая група фабрыкі «ПРАФІНТЭРН» уключылася ў паход і конкурс на лепшую рацыяналізатарскую прапанову Дэпутацкай групай узята шэфства над цэхам вырабу ваеннай вопраткі — арцелі «УПЕРАД», у сэнсе перадачы вопыту работы фабрыкі сампрамарцелі

Вылучана буксірная брыгада на фабрыку імя ЛЕКЕРТА па дапамозе апошняй у ліквідацыі прарыву па мабілізацыі сродкаў.

Паслана ў падшэфны сельсавет брыгада для аказаньня дапамогі ў арганізацыі ў калгасах дэпутацкіх груп і арганізацыі савецкага юрмапу

Вульфовіч.

Утыльцэх завода імя Молатава працуе з прарывамі

ЦК УсеКП(б) у сваіх пастановах прызнаў неабходным павялічыць выпуск тавараў шырспажыву і хутчэйшь іх тавараазвароту, бо гэта зьяўляецца адным з важнейшых галін палепшаньня матэрыяльнага становішча рабочых.

Аде гэтая пастанова ігнаруецца партыйным і прафсаюзным арганізацыямі заводу імя Молатава. Утыльцэх працуе бяз усякага кіраўніцтва з іх боку, а таму і прамфінплян сыстэматычна ня выконваецца. Так за кастрычнік месяц плян быў выкананы толькі на 41 проц. Такі прарыў адтрымаўся яшчэ і таму, што 6 гістарычных умоў тав Сталіна не пакладзены ў аснову работы цэху. У ім панае поўная абязьлічка, няма правільнай расстаноўкі рабочай сілы. За рабочымі не замацаваны пэўныя станкі. У цэху поўная безгаспадарчасьць. Хто што хоча той тое і робіць. Згодчых цэху тав. Ліўшыц рэдка ў ім бывае і таму там поўная адсутнасьць дысцыпліны. Утыльцэх не працуе выключна на адыходах, якіх у вялікай колькасьці ёсьць на заводзе, ён працуе і на добрай сыравіне, якую маглі-б скарыстаць іншыя цэхі заводу. Гэтае пытаньне мае вялізарнае палітычнае значэньне. Між тым партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі і адміністрацыя цэху, не аддалі максымум энэргіі на скарыстаньне адыходаў, на палепшаньне якасьці прадукцыі, на хутчэйшую ліквідацыю недахопаў, ігнаруючы гэтым самым рашэньні партыі і ўраду.

Утыльцэх ня мае сталых вытворчых брыгад. Брыгады арганізуюцца і распадзень-два распадаюцца. Бюро парткалектыву тлумачыць гэта тым, што на заводзе «вялікая цякучасьць рабочай сілы». Бязумоўна, гэта не бальшавіцкае тлумачэньне маючыхся недахопаў, гэта толькі ачкаўцарацельства. Прычына распаду брыгад ня ў тым, што на заводзе цякучасьць рабочай сілы, а ў тым, што партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі не пераключыліся на ізы, яны не забясьпечылі сваім штодзённым кіраўніцтвам нармальную работу брыгад.

Шмат рацыяналізатарскіх прапаноў на лепшае скарыстаньне адыходаў пакладзены адміністрацыяй пад сукно. Рабочы Трыгубовіч унёс рацыяналізатарскую прапанову, якая павялічыла-б прадукцыйнасьць працы ў два разы і дала вялікую эканомію ў сыравіне, паменшыўшы брак

Усе гэтыя недахопы павінны быць тэрмінова выпраўлены. Утыльцэх павінен выканаць свой прамфінплян на 100 проц. Магчымасьці ў яго для гэтага ёсьць. Выканаць прамфінплян—першачарговая задача трыкутніка заводу імя Молатава

Брыгада газэты «Савецкая Беларусь» Явіч, Трыгубовіч, Каган і Гарстан

Дыспут аб V усебеларускай мастацкай выстаўцы

28 лістапада г. г. у галоўным корпусе Ўніверсытэцкага гарадку адбыўся пад старшынствам т. Вольскага дыспут наладжаны Інстытутам Літаратуры і Мастацтва Акадэміі Навук аб V мастацкай выстаўцы

З вялікім дакладам аб выстаўцы выступіў навуковы супрацоўнік Інстытуту ЛІМ БАН т. Усс. Дакладчык адзначыў бясспрэчныя дасягненьні мастацкага фронту БССР, паварот асноўнай масы мастакоў да новай тэматыкі. У дакладзе т. Усс адзначыў і тое, што яшчэ ня ўсе мастакі здолелі ўзьняцца да сапраўднага разуменьня савецкай рэчаіснасьці. На ўсе мастакі здолелі паказаць у мастацкіх вобразах нашу рэчаіснасьць, поўную вялізарных дасягненьняў ва ўсіх галінах грамадзкага жыцьця і будаўніцтва

Дакладчык падрабязна спыніўся на творчасьці мастака Семашкевіча, у якога выяўлен у значнай ступені фармалізм, няглыбокі падыход да рэчаіснасьці. Адначасова, тав Усс даў ацэнку творам мастакоў Грубэ, Бразэра, Азгура, Пашкевіча, Кастэлянскага, Ахрэмчыка і інш. У дакладзе адзначана, што выстаўка паказала вялікі і здаровы пэрыяд у развіцьці выяўленчага мастацтва БССР.

У спрэчках выказаліся т. т. Кастэлянскі, Ахрэмчык, Азгур, Орыштэйн, Гаўрыленка, Кенпіс, Сокалаў, Вахсэр і інш

Закрываючы дыспут, т. Вольскі адзначыў, што інстытут ЛІМ мяркуе ў дамейшым арганізоўваць індывідуальныя выстаўкі творчых мастакоў, з іх творчымі справаздачамі і шырокім абгаварэньнем усёй мастацкай прадукцыі

Дыспут выклікаў вялікую зацікаўленасьць сярод грамадзкасьці і прыцягнуў да ўдзелу ў ім шмат пісьменнікаў, мастакоў, навуковых работнікаў, студэнтаў і рабочых з гурткоў самадзейнага мастацтва.

Э. Фр.

Хроніка

▲ Усебеларускія курсы марксызму-ленінізму для навуковых работнікаў арганізоўвае ЦП сэкцыі. Вылучана бюро курсаў, якому даручана распрацаваць праграму і заданьні па паасобных гэмах. Пры кожнай ВНУ стварэюцца групы курсаў, якія будуць працаваць па агульнай праграме. Устаноўлены адзін дзень работы курсаў—30 кожнага месяца, прычым у гэты дзень па дагаворанасьці Наркамасьветы ня могуць скліцаца ніякія пасяджэньні з удзелам навуковых работнікаў

Курсанты, якія лепш прапрацуюць праграмы, будуць прэм'яваны навуковай літаратурай і навуковай камандыроўкай.

Для разгортваньня прапаганды марксызму ленінізму Гарбюро сэкцыі прапанована выкарыстаць кампанію ў сувязі з 50-цігодзьдзем са дня сьмерці Карла Маркса.

* * *

▲ Работы па скончэньні пабудовы клінкернага завода ў Менску шырока разгорнуты. Пуск завода мяркуецца 1-га чэрвеня 1933 г.

* * *

▲ Месячнік па арганізацыі ячэек Таварыства вынаходнікаў у МТС, саўгасах і калгасах абвешчаны цэнтральным саветам Таварыства вынаходнікаў.

* * *

▲100.000 рублёў вызначыў Менскі Савет таварыства «Прыхільнік Дзяцей» на пабудову гарадка для былых бясспрытульных і выхаванцаў дзетдамоў.

ПАПРАЎКА

У нумары 266 газэты «Савецкая Беларусь» ад 3 сьнежня, на 1-й старонцы ў ПАСТАНОВЕ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР «ПРА ПЕРАПІС БУДАЎНІЧЫХ РАБОТ, ПРАВЕДЗЕНЫХ У 1931-32 г. г.» у апошнім пункце надрукавана: «Даручыць Народнаму Камісарыяту Фінансаў і Кіраўніцтву Народна-Гаспадарчага Ву чоту адпусьціць»

Трэба чытаць: «адпусьціць».

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

По Саюзе ССР

▲ **ВАРАШЫЛАЎСК.** Будаўнічыя і мантажныя работы на новай домне № 1 Варашылаўскага мэталюргічнага заводу праходзяць узмоцненым тэмпам

РЫКАВА. На мэталюргічным заводзе імя Рыкава цалкам скончаны будаўнічыя работы на новай буйной домне № 3. Пуск новай домны намечаны на 10 сьнежня

МАЎЧАНАЎСК. 1-XII. Да XV гадавіны Кастрычніка Кахановўская арцель «Луч труда» выканала плян абожжа-загатовак на 102 проц.

Пры ўзросшым натуральным і грашовым даходзе калгас уласнымі сіламі пабудаваў у гэтым годзе новую школу коштам у 18 тыс. руб абсталяваў новая стайня, пабудаваны птушатнік і кароўнік

ГРЫШЫНА. У вынику шырокага разгорнутай масавай работы на шахце імя Скрыпніка заўважаецца значнае скарачэньне прагулаў. У першае паловe лістапада штодзённа на выходзе за на работу да 100 чалавек, а зараз прагулы зьнізіліся да 10 у дзень

▲ **КІЕЎ.** Чэха-славацкая рабочая дэлегацыя наведала завод «Бальшавік». На мітынзе адзін з удзельнікаў дэлегацыі зрабіў наступную заяву. «32 гады я быў у радах сацыял-дэма кратычнай партыі і змагаўся пад яе сьцягам Зараз-жа пазнаёміўшыся з тым, што зрабіў юны гігант—рабочая кляса СССР, я пераканаўся, што адзна верны шлях для пралетарыяту Усяго сьвету — шлях пралетарыяту краіны Саветаў. Сацыял-дэмакраты-ж ведуць пралетарыят па шляху мучэньня і да новага жабрацтва»

▲ **СТАЛІНО. 2-XII** У Сталіно прыбыла дэлегацыя францускіх рабочых. Дэлегацыя наведала завод імя Сталіна, дзе гутарыла з рабочымі. Удзельнікі дэлегацыі наведалі таксама клюб мэталістаў імя Леніна, дзе правялі асаблівы інтарэс да рабочай прапаганды

▲ **МАСКВА.** ЦКК РСІ СССР абавязала Наркамцяжпром і Наркамат камунальнай гаспадаркі стварыць у най карацейшым тэрмін камісію для разгляду і канчатковага зацьвярджаньня праекту сацыялістычнага гораду Магнітагорску.

▲ **МАСКВА.** МТС на чале зімовай рамонтнай кампаніі. Паводле апошніх вестак Трактарацэнтру ва ўсіх МТС Саюзу (за выключэньнем бавўняных) адраманітавана 2029 трактароў.

▲ Саюзны Наркамзем прапанаваў мясцовым земорганам зараз-жа пачаць падрыхтоўку калгасных кадраў масавай кваліфікацыі. Тэрмін навучаньня брыгадзіраў вызначаны ў два месяцы, трактарыстаў-рулявых—3—4 месяцы, шафераў—4 месяцы, паляводаў 3 месяцы і г. д.

Падрыхтоўка і перанавучэньне калгасных кадраў павінна быць у асноўным праведзена без адрыву ад вытвор часьці. У паўднёвых раёнах Саюзу падрыхтоўку новых кадраў трэба скончыць да 1-га сакавіка, а ў паўночных раёнах—да 1-га красавіка 1933 году.

▲ **МАСКВА.** Учора пачаўся трэці ўсесаюзны конкурс лепшых чыгуначнікаў Саюзу. На заваёву першага месца ў конкурсе запісалася 500 таварных і пасажырскіх паравозных брыгад далёкага сьледваньня, 100 вагона-рамонтных брыгад, 100 вагона-рамонтных зьмешна абмеенных пунктаў, 100 кандуктарскіх брыгад і 100 брыгад змазчыкаў.

Паседжаньне конкурснай камісіі

7 сьнежня, а 5-й гадзіне дня, у памяшканьні рэдакцыі газ. «Савецкая Беларусь» адбудзецца чарговае паседжаньне Цэнтральнай усебеларускай камісіі конкурсу друку.

На парадку дня стаяць наступныя пытаньні:

1. Даклад газэты «Чырвоная Зьмена» аб удзеле ў конкурсе друку; даклад ЦП саюзу працасьветы аб выкананьні сацдагавору па садзейнасьці рэалізацыі пазыкі; даклад сэктару культпадбудаўніцтва (Зайцаў—газ. «Сав. Бел.»).

2. Даклад трох раённых газэт — «Камуніст» (Бабруйск), «За калектывізацыю» (Старыя Дарогі), «Сацыялістычная перамога» (Чэрыкаў) па іх удзеле ў конкурсе друку.

На паседжаньне Цэнтральнай конкурснай камісіі павінны зьявіцца прадстаўнікі газэт—«Зьвязда», «Рабочий», «Акцябр», «Рабселькор», «Орка», «Калгасьнік Беларусі», НКФ БССР, ЦК ЛКСМБ, ЦСПСБ, саюзу ФВР, ЦКамсоду, Калгасцэнтру і Белкаапсаюзу

Яўка вышэйпералічаных прадстаўнікоў абавязкова.

Цэнтральная конкурсная камісія.

Умовы прыёму

на аднагадовае аддзяленьне курсаў райпартактыву пры ЦК КП(б)Б, якія рыхтуюць работнікаў КК-РСІ

1. Гадовыя курсы работнікаў КК-РСІ маюць сваёй мэтай падрыхтоўваць кіруючых работнікаў райКК-РСІ.

На курсы прымаюцца партыйна-выдзеленыя, праверэныя на практычнай рабоце члены КП(б)Б з 5 гадовым партыйным стажам, якія маюць на меньш 3-х год вопыту адказнай партыйнай савецкай прафсаюзнай работы або работы ў органах КК-РСІ.

УВАГА: члены партыі, якія маюць стаж вытворчай работы, пры паступленьні маюць перавагу.

Для паступаючых необходна мець адукацыю: агульную ня менш 5 груп сямігодкі, палітычную ў разьмерах ВСПШ.

2. За паступаючымі на курсы захоўваецца іх пенсія на месцы ранейшай іх работы і іх сем'і застаюцца ў тых ЗРК, у якіх состаялі да паступленьня на курсы

3. Курсанты на месцы забясьпечваюцца: харчаваньнем, інтэрнатам і посьцельнымі прыладамі.

Заняткі пачынаюцца з 1-га студзеня 1933 г. Заявы прымаюцца да 15-XII—32 г.

Заявы, анкеты, камандыроўкі, даведкі аб стане здароўя і астатнія дакументы накіроўваць па адрасе курсаў райпартактыву пры ЦК КП(б)Б Менск, тэрыторыя былой выстаўкі

4. Устанаўліваецца наступная разьвёрстка па раёнах:

Менск—6, Гомель—6; Віцебск—6 Магілеў—4; Барысаў—4; Ворша—3 Бабруйск—3, Мазыр—2; Рагачэў—2 Слуцак—2; Жлобін—2; Клімавічы—1 Полацак—1, Дзяржынск—1.

Сакратар ЦК КП(б)Б Жаброўскі
Нам. Наркому РСІ Бел. Гурэвіч

ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР (БДТ 1)
2, 3, 4, 5 і 6 сьнежня Кузьма Чорны
„Бацькаўшчына"
у 4-х дзеях.
Пачатак а 8 гадз увечары. Білеты ў рабочай касе і ў касе театру

КІНО „ІНТАРНАЦЫЯНАЛ"
Каса ад 12 гадз.
Ад 1-га сьнежня
мастацкі гістарычны фільм Саюзкіно
НОВЫ ВАВІЛЁН
Зьвыш праграмы кіно-хроніка Саюзкіно.

Менгарком Чырвонага крыжу,
даводзіць да ведама ўсіх слухачоў мэдкурсаў.
што 7-XII-32 г.
ПАЧЫНАЮЦЦА ЗАНЯТКІ.
Хто спозьніцца к гэтаму тэрміну, будзе выключаны з ліку слухачоў мэдкурсаў.
Менгарком Чырвонага Крыжу

ДЗЯРЖАРБІТРАЖ пры СНК БССР
даводзіць да ведама ўстаноў, прадпрыемстваў і аграмаджанага сэктару.
што з 15 лістапада 1932 г. у гарадох
ГОМЕЛІ і ВІЦЕБСКУ
РАСПАЧАЛІ СВАЮ ДЗЕЙНАСЬЦЬ
міжраённыя органы Дзяржаўнага Арбітражу.
ДЗЯРЖАРБІТРАЖ.

Загад № 16

Беларускага Дзяржаўнага Інстытуту Савецкага Будаўніцтва і права.

16 лістапада 1932 г. Гор Менск.

§ 1.

Студэнту II курсу аддзяленьня Судова-Пракурорскага, дабнага факультэту, т. ГРАЙЗЕЛЬ МАНЮ МАЙСЕЙЎНУ за дэзэртырства і вучобы выключыць з ліку студэнтаў Інстытуту без права паступленьня ў іншыя ВНУ і ВТНУ на працягу ДВУХ год.

Дырэктар Інстытуту ЖУКАЎ.

ПАСТАНОВА

Прэзыдыуму Менгарпрафсавету ад 28 лістапада 1932 года

Аб правядзеньні месячніку ліквідацыі прарыву загатоўкі і вывазкі дроў для Менску

1. Прэзыдыум Менгарпрафсавету канстатуе, што плян IV кварталу па загатоўцы дроў для Менску на 20 лістапада выкананы на 26,6 проц., па вывазцы 12,3 проц., што зьяўляецца яўным зрывам забясьпечаньня дровамі пралетарскага цэнтру

2. Работнікі на месцах Гартопу і Лесбелу недастаткова ўдзялілі ўвагу гэтаму палітычнаму пытаньню па ізаляцыі сялянскіх мас на вывазку дроў да чыгункі, з прычыны чаго плян завозу дроў Менску на IV квартал сарваны. Павінна быць завезена 150 000 к. м., завезена на 26-XI 36.360 к. м., што складае 24,3 проц. пляну IV кварталу.

Выходзячы з гэтага, прэзыдыум ГСПС пастанаўляе:

Абавязаць ФЗМК, Гартоп, Лесбел, усе ЗРК, МГРК, ТСТ, Менскае аддзяленьне Белгандлю і іншыя казённрацыйныя арганізацыі ўключыцца ў месячник ліквідацыі прарыву па загатоўцы і вывазцы дроў Менску, абвешчаны ЦК КП(б)Б, які будзе праводзіцца з 1-XII—32 г. па 1-I—33 г.

Улічваючы, што на час правядзеньня месячніку да Менску прымацаваны 7 лесграмгасаў, лічыць необходным з мэтай поўнага выкананьня заданьняў па кожным вучастку прымацаваць да:

1. Асіповіцкага Лесграмгасу: ЗРК «Акцябр», МГРК, ЗК міліцыі і ДПУ
2. Бабруйскага Лесграмгасу: Менаддзяленьне Белгандлю, ТСТ, ЗРК Будаўнікоў
3. Клічаўскага Лесграмгасу: ЗРК мэталістаў, «Бальшавік», ЗРК Сувязі
4. Парыцкага Лесграмгасу: ЗРК імя Молатава, Абутнік, Кераміко ў
5. Глускага Лесграмгасу: ЗРК друкарні імя Сталіна, «Камунарэ», Кераміко ў і фабрыкі імя Крупскай

Прапанаваць усім ЗРК ад асобістую адказнасьць старшынь вышэйпералічаных прадпрыемстваў для пасылкі ў прымацаваньня да іх Лесграмгасы на час правядзеньня месячніку, усклаўшы на іх абавязкі 100-процантнага выкананьня заданьняў па адгрузцы і вывазцы дроў з прымацаванага вучастку

Сыпк вылучаных таварышоў дасьлаць ГСПС у прохадзенны тэрмін

Прапанаваць Гартопу забясьпечыць вылучаных таварышоў належнымі дакумэнтамі і ўказаньнямі

Просіць ЦСПСБ прапанаваць саюзу Лесаставу на час правядзеньня месячніку пасьлаць культвыхавэчную брыгаду, асабліва на вучастках, якія прымацаваны да Менску.

Менгарпрафсавет.

Гарком саюзу Працасьветы паведамляе, што 4-XII а 7-й гадзіне ўвечары у памяшканьні Дому Асьветы адбудзецца справаздачны сход спажыўказённых ЦРК і Белгандлю. Пасьля сходу мастацкая частка

Старшыням МК і прафпаўпаважаным забясьпечыць яўку пайнікаў сабраў саюзу на сход

Гарком Саюзу Працасьветы

У АДДЗЕЛ
АБВЕСТАК
званіце па тэл. 244

Нарсуд 1-га вучастку гор. Менску на падставе прысуду ад 22-IX—32 г. абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. КАНОНУ Эліяхуму Аўсееву, які жыве па Могілёўскай 41, кв. 3.

Нарсуд 1-га вучастку г. Менску на падставе прысуду ад 14-VI—32 г. абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. РУДКОЎСКАЙ Марыі Уладзімірэўне, якая жыве па вул. Розы Люксэмбург, 32—2.

Нарсуд 1-га вучастку г. Менску на падставе прысуду ад 23-IX—32 г. абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. ТУПІКУ Мікалаю Аляксееваму, які жыве па Людаменскай, 17-7, кв. 1.

Нарсуд 1-га вучастку г. Менску на падставе прысуду ад 14-IX—32 г. абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. ЕСЕЛЕВАЙ-ШЫЛЬКО Жані Львовай, якая жыве па Кастрычніцкай, 17, кв. 1.

Нарсуд 1-га вучастку г. Менску на падставе прысуду ад 14-IX—32 г. абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. ЕСЕЛЕВАЙ Лідзе Львовай, якая жыве па Кастрычніцкай, 17, кв. 1

Менскі гар. ЗАГС выклікае на 8 студзеня 1933 г. на 9 гадз. ранішцы гр. Бандарэнку Алеся Юркавага па справе аб скасаваньні шлюбу з гр. Бандарэнка Луцыяй

Менскі гар. ЗАГС выклікае на 3 студзеня 1933 г. на 9 гадз. ранішцы гр. Шэйхіна Давіда Ішкавага па справе аб скасаваньні шлюбу з г. Шэйхінай Рохлей-Іткай Эльлівай.

Менскі гар. ЗАГС выклікае на 14 сьнежня 1932 г. на 9 гадз. ранішцы гр. Дзядзюка Рытора Нічыпаравага па справе аб скасаваньні шлюбу з гр. Дзядзюк Мар'яй Мікалаевай.

Менскі гар. ЗАГС выклікае на 17 сьнежня 1932 г. на 9 гадз. ранішцы гр. Коўшыкава Васіля Рыгоравага па справе аб скасаваньні шлюбу з гр. Коўшыкавай Ганнай Францавай

Гр-н ПАЦІН АНТОСЬ АДАМАЎ
зьмяніе сваё прозьвішча а на
БЯРЭЗІНСКІ.
Асоб, якія маюць прэтэнзіі, просьба пераадрэсаваць у Барысаўскі ЗАГС.

Друкарня імя Сталіна